**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду III склікання**

# РАШЭННЕ
аб неабходнасці прывядзення спіса кандыдатаў выбарчага суб’екта ў адпаведнасць з Палажэннем і вызначэнні для гэтага тэрміну

23 траўня 2024 года г. Варшава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду III склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разгледзіўшы на адкрытым пасяджэнні 23 траўня 2024 года пытанне аб магчымасці захавання ў актуальным выглядзе для ўдзелу ў выбарчым працэсе спісу кандыдатаў выбарчага суб’екта “Наша справа”, заслухаўшы довады лідара спісу Розы Турарбекавай,

## ВЫЗНАЧЫЛА:

Падставай для ініцыявання разгляду стала меркаванне чальцоў Выбарчай камісіі аб неадпаведнасці спіса кандыдатаў выбарчага суб’екта “Наша справа” патрабаванням Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 траўня 2024 года (далей - Палажэнне), а менавіта пп. 3.2.4 пункта 3, які прадугледжвае забеспячэнне гендарнай квоты.

21 траўня 2024 года ў 09:26 (CET) на адрас Выбарчай камісіі пастуліла заява ад кандыдата выбарчага суб’екта “Наша справа” Яны Цыгалка пад нумарам 13, у якім апошняя просіць выключыць яе са спісу кандыдатаў выбарчага суб’екта.

21 траўня 2024 года ў 15:48 (CET) Выбарчая камісія накіравала на адрас лідара спісу кандыдатаў “Наша справа” Розы Турарбекавай ліст наступнага зместу:

“Шаноўная спадарыня Роза!

У Выбарчую камісію паступіў ліст аб выключэнні са спісу кандыдатаў "Наша справа" Яны Цыгалка (№13).

Рашэнне пакуль фармальна не прынятае, але гэта пытанне часу, паколькі падставы адмовіць Я. Цыгалка ў просьбе выключыць са спісу адсутнічаюць.

Узнікае наступная праблема для Вашага спісу:

Згодна з пп 7.2. пункта 7 Палажэння, "у выпадку, калі па выніках выхада кандыдата са спісу ў ім застаецца меней 10 кандыдатаў ці не выконваюцца іншыя патрабаванні дадзенага Палажэння да спіса кандыдатаў, рашэнне аб рэгістрацыі выбарчага суб’екта адмяняецца.

У адпаведнасці з пп 3.2.4. пункта 3 Палажэння кожны выбарчы суб'ект абавязаны забяспечыць гендэрную квоту ў сваіх спісах на ўзроўні 40%, прычым у кожнай пяцёрцы кандыдатаў павінна быць не менш за дзве жанчыны, з магчымасцю зніжэння квоты да 20% (у кожнай пяцёрцы кандыдатаў павінна быць не менш за адну жанчыну) рашэннем Выбарчай камісіі для тых выбарчых суб’ектаў, якія аб’ектыўна не могуць выканаць квоту ў 40% (арганізацыі ў сферы бяспекі, ветэранскія і іншыя падобныя арганізацыі).

Да выключэння Яны Цыгалка са спісу, удзельная колькасць жанчын складала 38,46 працэнты, што дазваляла Выбарчай камісіі сцвярджаць пра забяспечэнне гендэрнай квоты "на ўзроўні 40%" (з улікам папярэдне выкананых умоваў для ўдзелу ў выбарах). Цяпер жа, пасля выключэння са спісу Яны Цыгалка, у выбарчага суб'екта "Наша справа" застанецца толькі 12 чалавек, сярод якіх толькі 4 жанчыны, што складае 33,33% ад агульнай колькасці і, адпаведна, абавязковая гендарная квота не выконваецца на патрэбным узроўні.

Гэта змушае Выбарчую камісію адмяніць рэгістрацыю выбарчага суб'екта "Наша справа", у выніку чаго Вашая каманда не зможа ўдзельнічаць у выбарах.

Якія ёсць варыянты вырашэння сітуацыі?

1) Яна Цыгалка, паразмаўляўшы з сапраўднымі юрыстамі (былымі адвакатамі-практыкамі) і зразумеўшы, што крымінальная справа ўжо ўзбуджана і не будзе скасаваная - накіроўвае новую заяву, у якой просіць не разглядаць папярэднюю;

2) кандыдаты Андрэй Жукавец і Віктар Саскевіч падаюць заявы аб сваім выключэнні са спісу. Але варта мець на ўвазе, што ў выпадку выключэння яшчэ хаця б аднаго кандыдата, "Наша справа" не зможа прыняць удзел у выбарах;

3) Вы звяртаецеся на адрас Выбарча камісіі і тлумачыце, што ў сувязі з намерам Яны Цыгалка адмовіцца ад удзелу ў выбарах узнікла неабходнасць удакладніць дадзеныя пра Ваш выбарчы суб'ект. Неабходна патлумачыць прычыну, чаму ў дачыненні да Вас павінна быць зніжана гендарная квота, а менавіта:

- адсутнасць аб’ектыўнай магчымасці выканаць квоту ў 40% (арганізацыі ў сферы бяспекі, ветэранскія і іншыя падобныя арганізацыі)"

- улічыць форс-мажорныя абставіны і заявіць па адсутнасць намеру ўхіліцца ад памеру квоты.

З павагай,
Выбарчая камісія”

23 траўня 2024 года ў 10:26 (CET) ад выбарчага суб’екта “Наша справа” пaступіў адказ наступнага зместу:

“Паважаныя чальцы выбарчай камісіі,

Звяртаемся да вас з просьбай разгледзець магчымасьць не пазбаўляць нас рэгістрацыі выбарчага суб'екта ў сувязі з абставінамі, якія не залежаць ад нашай волі.

У апошнія тыдні на ўдзельнікаў нашага спісу быў аказаны дадатковы моцны ціск з боку беларускіх сілавых структур. У прыватнасьці, у выніку гэтага ціску, наш спіс былі вымушаныя пакінуць дзве жанчыны. Гэтыя дзеяньні звязаныя з прызнаньнем нашага спісу экстрэмісцкім фармаваньнем і завядзеньнем новых крымінальных спраў супраць сябраў нашага спіса. Да сваякоў адной з сяброўкі спіса прыходзілі двойчы, пад пагрозай знаходзяцца яе непаўнагадовыя дзеці, а другая сяброўка спіса была пад пагрозай застацца без ніякіх дакумантаў ва Украіне пад час вайны.

Таксама хочам падкрэсьліць, што рэжым аказвае асаблівы ціск на жанчын, улічваючы гендэрныя квоты. Удзел жанчын у палітычных працэсах становіцца практычна немагчымым. У сувязі з гэтым мы страцілі двух значных удзельніц нашага спісу, што можа паставіць пад пытаньне нашу рэгістрацыю выбарчага суб'екта.

Мы просім вас улічыць нашыя абставіны і праявіць разуменьне да складанасьцяў, з якімі сутыкаюцца сябры нашага спісу. Бо мы імкнемся працягваць удзел у дэмакратычным працэсе выбараў і прадстаўляць інтарэсы беларускіх грамадзянаў.

Загадзя дзякуем за ўвагу і спадзяемся на ваша справядлівае рашэньне.”

У дасланым адказе, Выбарчая камісія не ўгледзела ні належнага выкладання довадаў, ні прававога абгрунтавання, ні імёнаў, ні прозвішчаў, ні пацвярджэння ўказаных у лісце звестак, ні іншай канкрэтыкі, якая б дазволіла належна прааналізаваць і прыйсці да абгрунтаванай высновы аб наяўнасці форс-мажорных абставінаў у сітуацыі выбарчага суб’екта “Наша справа”.

З улікам такога неінфарматыўнага адказу, Выбарчая камісія палічыла неабходным даць магчымасць непасрэдна лідару спіса кандыдатаў выбарчага суб’екта “Наша справа” Розе Турарбекавай выразна і абгрунтавана выказаць пазіцыю на адкрытым пасяджэнні Камісіі, аб чым быў паведамлены зацікаўлены бок.

На адкрытым пасяджэнні Выбарчай камісіі было прынята рашэнне аб выключэнні са спісу кандыдатаў выбарчага суб’екта “Наша справа” Яны Цыгалка на падставе пададзенай ёй заявы. З моманту прыняцця дадзенага рашэння ўтварылася сітуацыя, якая не дазваляе лічыць выбарчы суб’ект “Наша справа” адпавядальным гендарнай квоце на ўзроўні 40%, паколькі колькасць жанчын у спісе кандыдатаў стала складаць 1/3 частку.

Пасля прыняцця рашэння аб выключэнні кандыдата Яны Цыгалка лідару спіса кандыдатаў выбарчага суб’екта “Наша справа” Розе Турарбекавай было прапанавана патлумачыць довады на карысць захавання спіса ў актуальным выглядзе, нягледзячы на неадпавяданне патрабаванням Палажэння.

1. Лідар спісу кандыдатаў выбарчага суб’екта “Наша справа” Роза Турарбекава прывяла довад аб тым, што патрабаванні да выканання выбарчым суб’ектам гендарнай квоты тычыліся толькі этапу рэгістрацыі выбарчага суб’екта і не распаўсюджваюцца на ўвесь перыяд правядзення выбараў. Пра гэта, у прыватнасці, сведчыць пп. 3.2 пункта 3 Палажэння, згодна з якім Выбарчая камісія **рэгіструе** ўсе выбарчыя суб’екты, якія адпавядаюць пералічаным патрабаванням, у тым ліку аб выкананні гендарнай квоты. Адпаведна, пасля рэгістрацыі выбарчага суб’екта дадзеная ўмова лічыцца выкананай і захоўвае сваё дзеянне на далейшы час, нягледзячы на магчымыя змены ў складзе спіса. Акрамя таго, лідар спісу лічыць, што прымяненне аналогіі недапушчальна, паколькі крытэры рэгістрацыі суб’екта адрозніваюцца ад падставаў адмены рэгістрацыі суб’екта. Паводле яе словаў, з пункту погляду логікі і здаровага сэнсу, у пункце 7.2 не прапісаны крытэры для адмены рэгістрацыі.

Выбарчая камісія не пагаджаецца з выкладзенымі довадамі, паколькі пп. 7.2 пункта 7 Палажэння адназначна сведчыць пра тое, што патрабаванні да выбарчага суб’екта **павінны выконвацца падчас усяго выбарчага працэсу**, бо ў іншым выпадку выбарчы суб’ект не ўправе працягваць удзел у электаральнай кампаніі: “*7.2. У выпадку, калі па выніках выхада кандыдата са спісу ў ім застаецца меней 10 кандыдатаў* ***ці не выконваюцца іншыя патрабаванні дадзенага Палажэння да спіса кандыдатаў****, рашэнне аб рэгістрацыі выбарчага суб’екта адмяняецца*”.

Таксама пра гэта сведчыць пп. 3.1 пункта 3 Палажэння, згодна з якім “***удзельнікамі выбараў*** *з’яўляюцца выбарчыя суб’екты...* ***якія адпавядаюць патрабаванням гэтага Палажэння***”. Згодна з пп. 1.1 пункта 1 Палажэння выбары ўключаюць у сябе шэраг этапаў, у тым ліку рэгістрацыю спісаў кандыдатаў, агітацыю, галасаванне і абскарджанне. **З гэтага вынікае, што неадпавяданне выбарчых суб’ектаў патрабаванням Палажэння не дазваляе ўдзельнічаць у выбарах, у прыватнасці на этапах агітацыі і галасавання.**

Патрабаванні да выбарчых суб'ектаў прадугледжаны ў тым ліку пп. 3.2 пункта 3 Палажэння. У прыватнасці, адным з такіх патрабаванняў, зыходзячы з пп. 3.2.4 пункта 3 Палажэння, з'яўляецца забяспячэнне гендарнай квоты ў спісах кандыдатаў "*на ўзроўні 40%, прычым у кожнай пяцёрцы кандыдатаў павінна быць не менш за дзве жанчыны, з магчымасцю зніжэння квоты да 20% (у кожнай пяцёрцы кандыдатаў павінна быць не менш за адну жанчыну) рашэннем Выбарчай камісіі для тых выбарчых суб'ектаў, якія аб'ектыўна не могуць выканаць квоту ў 40% (арганізацыі ў сферы бяспекі, ветэранскія і іншыя падобныя арганізацыі)*".

Акрамя таго, зыходзячы з дактрыны, прававая норма не можа быць бяссэнсавай. Выбарчая камісія, зыходзячы з Палажэння, канстатуе, што гендарныя квоты ўводзіліся з мэтай прымусова забяспечыць большую колькасць жанчын у Каардынацыйнай радзе, чым яна магла бы быць без увядзення квот. Адпаведна, Выбарчая камісія прыходзіць да высновы, што норматворца пры стварэнні Палажэння імкнуўся да таго, каб патрабаванні да гендарных квот выконваліся падчас усяго выбарчага працэсу. Варта таксама адзначыць, што адступленне ад гэтай нормы стварае рызыку для злоўжывання правам: у выпадку, калі выбарчыя суб'екты пасля рэгістрацыі спісаў кандыдатаў будуць выключаць з іх жанчын, пакідаючы толькі загадзя вызначаных "моцных" кандыдатаў, мэта забеспячэння у Каардынацыйнай радзе пэўнай гендарнай прапорцыі не будзе дасягнута.

2. Лідар спісу кандыдатаў выбарчага суб'екта "Наша справа" Роза Турарбекава таксама прывяла довад аб тым, што маюць месца выключныя (форс-мажорныя) абставіны. Яна адзначыла шэраг істотных акалічнасцяў, якія не змяшчаліся ў адказе на зварот Выбарчай камісіі. У прыватнасці, тое, што кіраўніцтва вайсковых фармаванняў Узброеных Сіл Украіны патрабуе адмовіцца ад удзелу ў выбарах чальцоў спіса "Наша справа".

Пры гэтым, у эфіры адкрытага пасяджэння Выбарчай камісіі Роза Турарбекава часткова абвергла дадзеную пазіцыю, патлумачыўшы, што сітуацыя з выбарчым суб'ектам "Наша справа" літаральна не з'яўляецца форс-мажорнай: "*Да, наверное, это не форс-мажор с буквальной точки зрения – то, о чем говорит Ярослав. И это никак не непредсказуемое, но это критическая и достаточно внезапная вещь, потому что человек мне говорит о том, что он выходит из списка за несколько дней до окончания кампании. И прекрасно понимая, конечно, в какое положение ставится вся команда... Я знаю, что моя ситуация не является каким-то исключением. Но в моем случае речь идет о том, что список маленький, и из 14 человек у меня две женщины ушли в результате чудовищного давления с двух сторон, не только со стороны режима. И в результате соблюдения формальной нормы о гендерной квоте - не в пять процентов, а все-таки в сорок – я должна попросить двух мужчин написать заявление. А это несправедливо в первую очередь в отношении них, потому что они уже на сегодняшний*

*день являются фигурантами уголовного дела, они уже являются жертвами. И вопрос: ради чего?*”

Заслухаўшы довады лідара спісу, Выбарчая камісія не выявіла акалічнасцяў, якія дазваляюць лічыць адзначаныя абставіны выключнымі (форс-мажорнымі). Так, за агітацыйны перыяд па заявах выбарчых суб’ектаў і саміх кандыдатаў шэраг асобаў быў выключаны са спісаў. У большасці такіх выпадкаў Выбарчай камісіі паведамлялася аб прычынах адмовы ад удзелу ў электаральнай кампаніі, і яны не мелі добраахвотны характар. У тым ліку ў якасці прычын называліся неправамерныя дзеянні беларускіх рэпрэсіўных органаў у дачыненні да сваякоў кандыдатаў і патрабаванні кіраўніцтва вайсковых фармаванняў Узброеных Сіл Украіны адмовіцца ад удзелу ў выбарах.

Прызнанне сітуацыі выбарчага суб’екта “Наша справа” форс-мажорнай азначала бы несправядлівае стаўленне да іншых выбарчых суб’ектаў, у дачыненні да чальцоў каторых і іх сваякоў таксама ажыццяўляюцца неправамерныя дзеянні з боку рэпрэссіўных органаў Беларусі. Выбарчая камісія непасрэдна атрымлівала звесткі аб тым, што пасля аб’яўлення ўсіх спісаў кандыдатаў экстрэміцкімі фармаваннямі і іншага ціску з боку рэпрэсіўных органаў Беларусі, шэраг кандыдатаў з розных выбарчых суб’ектаў выказалі намер адмовіцца ад удзелу ў выбарах. Тым не менш, многія з іх (у тым ліку жанчыны), разумеючы пра наступствы свайго сыхода для ўсёй каманды (змяненне парадку кандыдатаў спіса, адмена рэгістрацыі спіса праз невыкананне гендарнай квоты), прынялі рашэнне застацца ў спісе выбарчага суб’екта. Адпаведна, саступкі ў бок выбарчага суб’екта “Наша справа” ставяць у няроўнае становішча іншыя выбарчыя суб’екты, што з’яўляецца несправядлівым і, адпаведна, неправамерным.

3. Лідар спісу кандыдатаў выбарчага суб’екта “Наша справа” Роза Турарбекава прыводзіць довад аб недастатковай інфармаванасці наконт прымянення нормаў Палажэння, што, на яе думку, выклікана бяздзеяннем Выбарчай камісіі, якой неабходна было загадзя падрыхтаваць і данесці прававое тлумачэнне Палажэння (прынамсі, пытанняў гендарнай квоты).

Па дадзеным довадзе Выбарчая камісія зважае наступнае: за тлумачэнне нарматыўнага прававога акта адказны орган, які яго прыняў. Такім чынам, любая публічная трактоўка Палажэння павінна ажыццяўляцца Каардынацыйнай радай – органам, якім гэтае Палажэнне распрацоўвалася і прымалася, у складзе якога дзейнічала ў тым ліку Роза Турарбекава і якая, па звестках Выбарчай камісіі, рашуча падтрымлівала пытанне аб увядзенні гендарных квот у Палажэнне.

Акрамя таго, на прыкладах публічнага пасяджэння Выбарчай камісіі па справах выбарчага суб’екта “За годнасць беларусак” і кандыдата Аліны Коўшык (Коўшык-Петшыкоўскай), прыняцця Пастановы аб зацвярджэнні

спісаў выбарчых суб’ектаў ад 25 красавіка 2024 года і далейшых рашэннях аб унясенні зменаў у Пастанову, апублікаваных на сайце Каардынацыйнай рады прэс-рэлізаў – любы ахвочы мог зрабіць высновы аб практыцы прымянення Выбарчай камісіяй нормаў Палажэння датычна гендарных квот.

З гэтай прычыны, Выбарчая камісія не лічыць прыведзены довад абгрунтаваным і не прымае яго ў якасці падставы для невыканання патрабаванняў аб гендарных квотах, прадугледжаных Палажэннем.

4. Розай Турарбекавай прыведзены довад пра тое, што рашэнне Выбарчай камісіі “па духу не дэмакратычнае, гэта атака на дэмакратыю”.

Выбарчая камісія з выкладзенай высновай не пагаджаецца, паколькі дэмакратычны выбарчы працэс не дапускае надзялення аніякімі прывілеямі адных яго ўдзельнікаў над іншымі.

У адпаведнасці з пп. 4.7.2 пункта 4 Палажэння, праца Выбарчай камісіі грунтуецца на прынцыпе бесстароннасці,у тым ліку кіруючыся агульнапрызнанымі прынцыпамі правоў чалавека і стандартамі дэмакратычных выбараў.

Згодна з Асноўнымі прынцыпамі датычна выбараў, прынятых Венецыянскай камісіяй на 51-й пленарнай сесіі (Венецыя, 5-6 ліпеня 2002 года), усім партыям і кандыдатам павінны быць гарантаваны **роўныя магчымасці**. Пад гэтым, у прыватнасці, разумеецца бесстароннае стаўленне дзяржаўных органаў улады (ў дадзеным выпадку – Выбарчай камісіі як незалежнага органа па правядзенні выбараў) да выбарчай кампаніі.

Згодна з Тлумачальным дакладам, прынятым Венецыянскай камісіяй на 52-й пленарнай сесіі (Венецыя, 18-19 кастрычніка 2002 года), усім партыям і кандыдатам **павінны быць гарантаваныя роўныя магчымасці**, а дзяржаву (ў дадзеным выпадку – Выбарчую камісію) належыць заклікаць **быць бесстаронняй** у адносінах да іх і **забяспечваць аднастайнае прымяненне заканадаўства ў адносінах да ўсіх** (пункт 18).

Такім чынам, Выбарчая камісія не лічыць магчымым дазволіць выбарчаму суб’екту “Наша справа” ўдзельнічаць у выбарчым працэсе пры наяўнасці парушэння патрабаванняў да выканання гендарнай квоты.

Разам з тым, Камісія не бачыць патрэбы ў неадкладным парадку прымаць рашэнне аб адмене рэгістрацыі выбарчага суб’екта “Наша справа”, паколькі яно не спрыяе правам і магчымасцям прымаць удзел у вядзенні дзяржаўных спраў як непасрэдна, так і праз сваіх прадстаўнікоў, а таксама галасаваць і быць абранымі на выбарах, прадугледжаных пунктамі **a)**, **b)** артыкула 25 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. З гэтай прычыны чальцамі Камісіі ўзгоднена магчымасць прадастаўлення часу выбарчаму суб’екту “Наша справа” для прывядзення спіса кандыдатаў у адпаведнасць з патрабаваннямі Палажэння.

З улікам абмежаванняў часу, выкліканых неабходнасцю правядзення тэхнічных работ па актуалізацыі спісаў кандыдатаў на электронных рэсурсах для правядзення галасавання ў 00:00 25 траўня 2024 года, Выбрачая камісія лічыць неабходным прывесці спіс кандыдатаў выбарчага суб’екта “Наша справа” ў адпаведнасць з патрабаваннямі Палажэння ў тэрмін, не пазней 09:00 (CET) 24 траўня 2024 года.

З улікам выкладзенага, кіруючыся пп. 4.9 пункта 4 Палажэння, Выбарчай камісіяй

**ВЫРАШАНА:**

Выбарчаму суб’екту “Наша справа” – прывесці спіс кандыдатаў у адпаведнасць з Палажэннем аб выбарах у Каардынацыйную раду ў тэрмін не пазней 9 гадзін 00 хвілін (CET) 24 траўня 2024 года.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька